Чванаў Л

# НЕЎМІРУЧЫ ПОДЗВІГ САНДАМІРСКІ ПЛАЦДАРМ

Андрэй Іосіфавіч Мельнікаў нарадзіўся ў вёсцы Колбава ў 1914 годзе, калі ішла Першая сусветная імперыялістычная вайна. Сын селяніна Андрэй, як усякі вясковы хлопец, з маленства працаваў у сельскай гаспадарцы. Вучыўся, скончыў сямігодку, у 1936 годзе – Магілёўскі педтэхнікум.

Маладым спецыялістам быў накіраваны ў Быхаўскі раён. Работу ў школе спалучаў з завочнай вучобай у Магілёўскім падінстытуце на літаратурным факультэце. У 1939 годзе А. І. Мельнікаў быў прынят у кандыдаты ў члены партыі і ў гэтым жа годзе прызываецца на ваенную службу, адкуль накіроўваецца на вучобу ў Харкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча, якое скончыў у 1941 годзе.

Гітлераўская Германія парушыла мірнае жыццё савецкіх людзей. На абарону Айчыны ўзняліся мільёны верных сыноў і дачок. З першых дзён вайны на фронце і палітработнік А. І. Мельнікаў. Ён быў намеснікам камандзіра артдывізіёна па палітчасці, які ўваходзіў у састаў 425 артпалка 132 дывізіі. Дарэчы, дывізія першы свой бой з гітлераўскімі полчышчамі прыняла на беларускай зямлі пад Гомелем. Яе палкі дзейнічалі ў вялікай бітве пад Курскам, а потым гналі ненавіснага ворага на захад, вызвалялі раёны і гарады на Украіне: Канатоп, Бахмач, Нежын. У гэтых баях удзельнічаў і А. І. Мельнікаў. За мужнасць і адвагу ён узнагароджан ордэнам Айчыннай вайны, медалём "За баявыя заслугі".

Асабліва вызначылася дывізія пры вызваленні Бахмача. У час бою нямецкая пяхота пры падтрымцы авіяцыі і танкаў прымусіла часці дывізіі часова адыйсці. Андрэй Мельнікаў знаходзіўся на батарэі, у якой было чатыры гарматы. Разлікі выкацілі гарматы і прамой наводкай знішчылі да двух рот варожай пяхоты, падбілі два танкі і адну самаходную гармату. Савецкія часці перайшлі ў наступленне і ў хуткім часе горад бахмач быў вызвален. Не ўтрымалі захопнікі і Нежын, пасля якога перад воінамі прадстаў шырокі і слаўны Дняпро. Бітва за яго пачалася на шырокім фронце, у многіх месцах.

26 верасня 1943 года капітан А. І. Мельнікаў з групай разведчыкаў-сувязістаў пераправіўся на правы бераг ракі. Там ён арганізаваў разведку агнявых сродкаў ворага. Карэкціруючы агонь дывізіёна, знішчыў мінамётную і процітанкавую батарэі, чатыры кулямётныя кропкі, каля ўзвода гітлераўцаў. Сваёй ініцыятывай і дзеяннямі Мельнікаў забяспечыў часцям дывізіі пераправу праз Дняпро.

132 дывізія ўваходзіла ў састаў 60-й арміі, якой камандаваў генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі. 17 кастрычніка 1943 года 306

воінам 60-й арміі прысвоена званне Героя Савецкага Саюза за паспяховае фарсіраванне Дняпра. У гэтым спісу было прозвішча Мельнікава.

Супрацоўнікі дывізійнай газеты "У атаку" сталі друкаваць артыкулы пра Герояў Дняпра. Неяк у рэдакцыю заглянуў і капітан А. І. Мельнікаў. Як піша ў сваіх успамінах рэдактар газеты "У атаку" М. Шыбаліс: "Просім напісаць пра баі за Дняпро і наогул аб сваім настроі, аб чым думаў". А ў адказ: "Браточкі, некалі". У блакітных вачах яго заскакалі гарэзлівыя чорцікі, светлы чуб павіс па-над моцным ілбом.

"Добра, я тут крыху накідаю, а вы даведзіцё да ладу". Вось радкі з яго ўспаміну. "Успамінаецца зараз, як у 1941 годзе я сустракаў некаторых таварышаў, якія сумняваліся тады ў нашай перамозе... многа было баёў. Мы пагналі ворага на захад. І вось Дняпро. Канчатковая перамога блізка".

Але вораг лютаваў. Ён перайшоў у наступленне, каб зноў авалодаць плацдармам на правым беразе ракі, утрымаць Кіеў. Завязаліся ўпартыя баі. Савецкія войскі ўтрымалі плацдарм, але ў гэтых баях нямала загінула нашых байцоў і камандзіраў. У няроўнай схватцы з ворагам у раёне Радомышля Жытомірскай вобласці 28 кастрычніка загінуў капітан А. І. Мельнікаў.

Зараз імем Героя названы школа ў вёсцы Чыгірынка, вуліцы ў Кіраўску і іншых гарадах рэспублікі.

**Чванаў, Л. Неўміручы подзвіг / Л. Чванаў // Кіравец (Кіраўск). — 1986. — 3 ліпеня. — С. 2.**